УДК 373.2

**А. М. Гацко**
*Установа адукацыі «Баранавіцкі дзяржаўны універсітэт»,*
*Баранавічы, Рэспубліка Беларусь, agocko10@gmail.com*

# ДА ПРАБЛЕМЫ РАЗВІЦЦЯ КРЫТЫЧНАГА МЫСЛЕННЯ АСОБЫ Ў ПРАЦЭСЕ МОЎНАЙ АДУКАЦЫІ

У артыкуле разглядаецца сутнасць методыкі, накіраванай на развіццё здольнасці крытычнага мыслення студэнта, а таксама яе рэалізацыя пры чытанні лекцыі на беларускай мове, што дае магчымасць выкарыстоўваць розныя яе сродкі ў комплексе.

**Ключавыя словы:** педагагічная тэхналогія; крытычнае мысленне; метады і прыёмы развіцця крытычнага мыслення.

**A. M. Gatsko**
*Baranavichy State University, Baranavichy, the Republic of Belarus,*
*agocko10@gmail.com*

# TO THE PROBLEM OF DEVELOPING CRITICAL THINKING OF A PERSON IN THE PROCESS OF LANGUAGE EDUCATION

The article deals with the essence of the technique aimed at developing student's critical thinking skills as well as it's realization while lecturing in Belarusian, which gives a chance to use its various means as a comlex.

**Key words:** pedagogical technology; critical thinking; methods and techniques of developing critical thinking.

Репозиторий БарГУ

**Уводзіны.** Падрыхтоўка да жыцця ў адкрытым грамадстве патрабуе ад навучэнцаў развіцця такіх важных пазнавальных навыкаў, як уменне выпрацаваць асабістую думку, асэнсаваць вопыт, пабудаваць ланцуг доказаў. Традыцыйна школа знаёміла з прадуктамі мыслення, гэта значыць давала канкрэтныя веды, якія выражаны ў кнігах, лекцыях, але рэдка дэманстравала працэсы, з дапамогай якіх гэтыя веды былі атрыманы. У новай «Канцэпцыі развіцця сістэмы адукацыі Рэспублікі Беларусь»

© Гацко А. М., 2022

падкрэсліваецца, што ўстановам адукацыі неабходна «прымяняць тэхналогіі навучання, якія накіраваныя на фарміраванне ў студэнтаў крытычнага і творчага мыслення, сістэмнага аналізу, прадпрымальніцкіх навыкаў» [1]. Гэта адлюстроўвае сённяшнюю патрэбу педагагічнай навукі і практыкі ў новых падыходах да зместу і форм адукацыі, у сродках дасягнення вынікаў выхавання, адэкватных сучасным патрабаванням.

У існуючым сацыяльна-культурным становішчы грамадства інфармацыя не проста памнажаецца па аб'ёму ці ўскладняецца, але хутка становіцца ўстарэлай, ідэі пастаянна перапраўляюцца і пераасэнсоўваюцца. Галоўным «капіталам» выступае не сама інфармацыя, а здольнасць да яе эфектыўнага засваення, перапрацоўкі і стварэння. Інфармацыйнае грамадства прадугледжвае ўдасканаленне не толькі тэхнікі ці тэхналогіі, але і самаго чалавека, перш за ўсё, яго мыслення. Ніколі раней сістэма адукацыі не рыхтавала навучэнцаў ў такой дынаміцы змяненняў, непрадказальнасці, складанасці. Таму развіццё крытычнага мыслення з'яўляецца адной з базавых форм падрыхтоўкі да паспяховай жыццядзейнасці.

Ідэя культывавання крытычнага мыслення як гуманістычнай каштоўнасці знайшла адлюстраванне ў адукацыйных праграмах многіх краін свету. Такое разуменне ролі крытычнага мыслення, з аднаго боку, сведчыць аб актуальнасці і перспектыўнасці дадзенай праблемы, з другога — аб неабходнасці мэтанакіраванага яго фарміравання і ўдасканалення на ўсіх этапах навучання.

Д. Халперн у сваёй кнізе «Псіхалогія крытычнага мыслення» падкрэслівае, што адукацыя, разлічаная на перспектыву, павінна будавацца на аснове двух непадзельных прынцыпаў: уменне хутка арыентавацца ў імгненна растучай плыні інфармацыі і знаходзіць патрэбнае і ўменне асэнсаваць і прымяніць атрыманую інфармацыю [2, с. 29].

**Асноўная частка.** Праблема развіцця мыслення ў адукацыйным працэсе звязваецца з пытаннямі актывізацыі пазнавальнай дзейнасці (Е. С. Заір-Бек, І. А. Зімняя, А. Н. Ксенафонтава, Г. І. Шчукіна), арыентацыямі на творчае мысленне (Л. А. Грыгаровіч, Г. Ліндсэй, Р. Ф. Томпсан, П. Ф. Філіпаў, К. С. Халл), фарміраваннем альтэрнатыўнага мыслення (В. І. Загвязінскі, В. В. Краеўскі) і даследчай культуры асобы (Т. Е. Клімава, В. А. Сласценін).



Рэпазіторый БарДУ

Словы «крытычны» і «крытычнасць» вытворныя ад слова «крытыка». Акадэмічны «Тлумачальны слоўнік беларускай мовы» раскрывае адно з лексічных значэнняў слова «крытычны» наступным чынам: «Крытычны. 1. Які заключае ў сабе крытыку, з'яўляецца крытыкай. *Крытычныя заўвагі. Крытычны артыкул. Крытычная літаратура.* 2. Здольны крытычна адносіцца да каго-чаго-н. *Крытычны розум*» [3]. «Крытычнасць» — гэта ўласцівасць па значэнню прыметніка «крытычны» [3]. Такім чынам, крытычнае мысленне — гэта мысленне, якое ўтрымлівае крытыку, здольнае да крытыкі.

Разнастайнасць дэфініцый крытычнага мыслення, часам іх супярэчлівасць з'явіліся асновай для аналізу, сістэматызацыі і абагульнення падыходаў, удакладнення тэрміналогіі. Сучасныя ўяўленні пра крытычнае мысленне заснаваны на даследаваннях ў розных галінах навук: псіхалогіі, логіцы, філасофіі, таму ў педагогіцы нельга пазбегнуць падыходаў, занятых з розных дысцыплін.

У апошняе дзесяцігоддзе паняцце «крытычнае мысленне» ўвайшло ў тэрміналогію псіхалагічных і педагагічных даследаванняў розных вучоных. Пэўныя аспекты праблемы развіцця крытычнага мыслення асвятлены ў работах В. А. Болатава, Д. М. Шакіравай, І. В. Муштавінскай, А. В. Бутэнка, Л. А. Мальц, А. І. Федатоўскай, Д. А. Шарова, Л. І. Пунько, Г. М. Галузы, Н. В. Шуневіч, А. Ю. Бурнель, Н. В. Байдаковай і інш., у якіх сустракаем розныя дэфініцыі дадзенага паняцця.

На думку І. А. Загашава, задача развіцця крытычнага мыслення заключаецца ў тым, «каб вучні прыйшлі да разумення, асэнсавання ў саміх сабе праяў натуральнай чалавечай схільнасці лічыць сваё меркаванне і каштоўнасныя арыентацыі адзіна правільнымі, імкнуліся пераадолець гэту схільнасць» [4, с. 8].

Як заўважае І. В. Муштавінская, «крытычнае мысленне — гэта пункт апоры для мыслення чалавека, яго натуральны спосаб узаемадзеяння з ідэямі і інфармацыяй, пры сутыкненні з якімі вучні павінны ўмець разглядаць іх удумліва, крытычна, бачыць розныя пункты погляду, рабіць высновы» [5, с. 38].

Сёння ў грамадстве асабліва запатрабаваныя людзі з крытычным мысленнем, незалежнымі меркаваннямі. Заняткі па беларускай мове змяшчаюць багаты матэрыял для развіцця крытычнага мыслення. Найбольш прадуктыўнай, на наш погляд, з'яўляецца тэхналогія развіцця крытычнага мыслення пасродкам чытання і пісьма.

Репозиторий БарГУ

Крытычнае мысленне — гэта натуральны спосаб узаемадзеяння з ідэямі і інфармацыяй. Студэнты пастаянна стаяць перад праблемай выбару інфармацыі, якой неабходна не толькі авалодаць, але і крытычна ацаніць, асэнсаваць, прымяніць. Больш таго, крытычнае мысленне — мысленне рэфлексіўнае, адкрытае, якое развіваецца шляхам накладвання новай інфармацыі на асабісты жыццёвы вопыт. Гэтым і адрозніваецца крытычнае мысленне ад мыслення творчага, якое не прадугледжвае ацэначнасці. Аднак крытычнае і творчае мысленне развіваецца ў сінтэзе.

Тэхналогія развіцця крытычнага мыслення прызначана для таго, каб навучэнцы сталі лепш думаць, задаваць пытанні: «Як гэта суаднесці з тым, што я ўжо ведаю?» «Як я магу выкарыстоўваць атрыманую інфармацыю?» і інш.

Важна навучыць ставіць пад сумненне звесткі, якія паступілі з розных крыніц: кніг, выкладчыка, камп'ютара. Задача выкладчыка навучыць спосабам рашэння праблем, выпрацаваць навык выкарыстання ведаў у заканамерных і выпадковых сітуацыях. Менавіта такія якасці дапамогуць маладым людзям быць канкурэнтаздольнымі ў далейшай прафесійнай дзейнасці.

Базавая мадэль тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо складаецца з трох этапаў (стадый): выкліку, асэнсавання і рэфлексіі. Такая структура, на думку псіхолагаў, адпавядае этапам чалавечага ўспрымання: спачатку трэба настроіцца, успомніць, што табе вядома па гэтай тэме, затым пазнаёміцца з новай інфармацыяй, потым падумаць, для чаго табе спатрэбяцца атрыманыя веды і як ты іх зможаш прымяніць.

Кожная стадыя мае свае мэты і задачы, а таксама набор характэрных прыёмаў, накіраваных спачатку на актывізацыю даследчай, творчай дзейнасці, а потым на асэнсаванне і абагульненне набытых ведаў. Структуру тэхналогіі можна прапанаваць у выглядзе наступнай табліцы 1.

Т а б л і ц а 1 — Структура тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення

| Стадыя (фаза) | Дзейнасць выкладчыка | Дзейнасць навучэнцаў | Магчымыя прыёмы і метады |
|---|---|---|---|
| Выклік | Актуалізацыя ўжо атрыманых ведаў па | Навучэнец «успамінае», што яму вядома па | Складанне спісу «вядомай інфармацыі»; |

Рэпазіторый БарДУ

*Заканчэнне табліцы 1*

| Стадыя (фаза) | Дзейнасць выкладчыка | Дзейнасць навучэнцаў | Магчымыя прыёмы і метады |
|---|---|---|---|
| | вывучаемым пытанні; актывізацыя навучэнцаў; матывацыя для далейшай працы | вывучаемым пытанні, сістэматызуе інфармацыю да яе вывучэння, задае пытанні, на якія б хацеў атрымаць адказ | расказ-уяўленне па ключавых словах; графічная сістэматызацыя матэрыялу: кластары, табліцы; праўдзівыя і непраўдзівыя сцвярджэнні; пераблытаны лагічны ланцужок і інш. |
| Асэнсаванне | Актуалізацыя ўжо атрыманых ведаў па вывучаемым пытанні; актывізацыя навучэнцаў; матывацыя для далейшай працы | Навучэнец «успамінае», што яму вядома па вывучаемым пытанні, сістэматызуе інфармацыю да яе вывучэння, задае пытанні, на якія б хацеў атрымаць адказ | Складанне спісу «вядомай інфармацыі»; расказ-уяўленне па ключавых словах; графічная сістэматызацыя матэрыялу: кластары, табліцы; праўдзівыя і непраўдзівыя сцвярджэнні; пераблытаны лагічны ланцужок і інш. |
| Рэфлексія | Звярнуць навучэнцаў да першапачатковых запісаў; унесці змены, дапаўненні, даць творчыя, даследчыя ці практычныя заданні на аснове вывучаемай інфармацыі | Навучэнцы суадносяць «новую» інфармацыю са «старой», выкарыстоўваюць веды, атрыманыя на стадыі асэнсавання | Запаўненне кластараў, табліц; устанаўленне прычынна-выніковых сувязей паміж блокамі інфармацыі; зварот да ключавых слоў, праўдзівых і непраўдзівых сцвярджэнняў; адказы на пастаўленыя пытанні; арганізацыя вусных і пісьмовых круглых сталоў; напісанне творчых работ; даследаванні па асобных пытаннях тэмы і інш. |

Репозиторий БарГУ

Інфармацыя, якая была атрымана на першай стадыі, выслухоўваецца, запісваецца, абмяркоўваецца. Праца вядзецца індывідуальна, у парах або групах. На другой стадыі ажыццяўляецца непасрэдны кантакт студэнтаў з новай інфармацыяй (тэкст, лекцыя, матэрыял параграфа), праца вядзецца індывідуальна ці ў парах. Адметная асаблівасць стадыі рэфлексіі — творчая перапрацоўка, аналіз вывучаемай інфармацыі, праца вядзецца індывідуальна, у парах, групах.

Разгледзім дадзены працэс на прыкладзе лекцыйных заняткаў па беларускай мове пры вывучэнні тэмы «Марфемная будова слова».

Названая тэма не з'яўляецца новай у мовазнаўстве. Аднак яе можна дапаўняць у залежнасці ад таго, што ведаюць навучэнцы па гэтай тэме са школы. Зацікавіць і актуалізаваць новымі ведамі выкладчык павінен ужо на першым этапе сваёй работы. Так, пачынаючы разважанне па тэме, можна прапанаваць навучэнцам графічна прадставіць будову некалькіх слоў і запісаць азначэнне раздзела мовазнаўства — марфеміка (стадыя «выкліку»). У канцы лекцыі гэта азначэнне патрэбна будзе ўдакладніць, абапіраючыся на змест лекцыі.

У ходзе лекцыі навучэнцы выконваюць заданне творчага характару, сутнасць якога можна прадставіць прыёмам «інсерт» (табліца 2): запаўненне табліцы, якая мае на мэце ўважлівую перапрацоўку вучэбнага матэрыялу і выкарыстанне пры гэтым умоўных абазначэнняў (стадыя асэнсавання).

Для сістэматызацыі матэрыялу выкладчык прапануе суаднесці змест інсерта са схемамі марфемнай будовы. У выніку гэтага абгрунтоўваюцца новыя паняцці — постфікс, інтэрфікс, конфікс, перарывістая аснова. Выкладчык фармулюе навуковае азначэнне гэтых паняццяў і канкрэтызуе іх на практычным матэрыяле: бытапісальнік, асноватворны, паабвязваліся, суразмоўца.

Т а б л і ц а 2 — Прыём «інсерт»

| Ведаю (+) | Даведаўся (!) | Хачу ведаць (незразумела)? |
|---|---|---|
| | | |



Репозиторий БарГУ

Падтрымліваць цікавасць да тэмы ў навучэнцаў можна, прапанаваўшы новую інфармацыю — рэгулярныя і нерэгулярныя марфемы. Рэгулярныя марфемы: прыстаўкі *за-*, *на-*, *па-*, *пера-* ў назоўніках, прыметніках і дзеясловах; нерэгулярныя марфемы: канчаткі *-ыма (вачыма, трыма), -м (дам, ем), -ума (двума)*.

У канцы лекцыі выкладчык можа звярнуць увагу студэнтаў да першапачатковых запісаў, удакладніць азначэнне паняцця «Марфеміка» з улікам новых ведаў (стадыя рэфлексіі).

Магчымымі прыёмамі далейшай работы па тэме могуць стаць даследаванні па асобных яе пытаннях Добрым прыкладам з'яўляецца тэма «Гістарычныя змены ў аснове слова ў працэсе развіцця мовы». Для гэтага даследавання ёсць падстава: раней слова *парэчка* мела корань *-рэч-*, цяпер корань *-парэч-*, раней у слове пасада выдзяляўся корань *-сад-*, а цяпер — корань *-пасад-*. Такая сумесная праца выкладчыка і студэнтаў — адна з умоў развіцця крытычнага мыслення навучэнцаў.

Эфектыўным на занятках па мове з'яўляецца прыём «Канцэптуальная табліца», выкарыстанне якога мэтазгодна ў тым выпадку, калі прадугледжваецца параўнанне трох ці больш аспектаў. Табліца мае наступны выгляд: сярэдняя калонка называецца «Лініі параўнання», дзе пералічаны тыя катэгорыі, па якіх будуць параўноўвацца пэўныя з'явы, падзеі, факты, а ў калонкі, размешчаныя па два бакі ад «Ліній параўнання», заносіцца інфармацыя, якую неабходна параўноўваць. Дадзены прыём на занятках па беларускай мове можна выкарыстоўваць пры вывучэнні тэм «Стылі мовы», «Часціны мовы» і «Раздзелы мовазнаўства». Дадзены прыём садзейнічае абагульненню і сістэматызацыі ведаў па беларускай мове, устанаўленню ўзаемасувязей паміж рознымі ўзроўнямі моўнай сістэмы. Трэба адзначыць, што лініі параўнання выводзяць самі навучэнцы. Канцэптуальная табліца дазваляе ім сістэматызаваць інфармацыю, правесці паралелі паміж з'явамі, падзеямі, фактамі. Эфектыўнасць работы павышаецца пры групавым супрацоўніцтве. Пры гэтым выкладчык можа прапанаваць асобныя крыніцы інфармацыі па тэме.

**Заключэнне.** Развіццё крытычнага мыслення — педагагічная тэхналогія, якая абумоўлена патрэбай часу. Узаемадзеянне інфармацыі з ідэямі дае магчымасць крытычнага і творчага

Рэпазіторый БарДУ

мыслення, якія разглядаюцца як адзінае цэлае і складаюць яе сутнасць. Тэхналогія крытычнага мыслення можа паспяхова рэалізавацца ў працэсе моўнай адукацыі на ўсіх яе этапах. Лекцыя як асобны тып заняткаў арганічна ўключае розныя прыёмы тэхналогіі крытычнага мыслення.

**Спіс цытуемых крыніц**

1. Концепция развития системы образования Республики Беларусь до 2030 года [Электронный ресурс]. — Минск : [б. и], 2021. — Режим доступа: https://edu.gov.by/kontseptsiya-do-2030-goda/%D0%BA%D0%BE%D0%BD%D1%86%D0%B5%D0%BF%D1%86%D0%B8%D1%8F.pdf . — Дата доступа: 12.10.2022.

2. *Халперн, Д.* Психология критического мышления / Д. Халперн. — СПб. : Питер, 2000. — 289 с.

3. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы: больш за 65 тыс. слоў / пад рэд.: М. Р. Судніка, М. Н. Крыўко. — 4-е выд. — Мінск : БелЭн, 2005. — 784 с.

4. *Загашев, И. О.* Учим детей мыслить критически / И. О. Загашев, С. И. Заир-Бек, И. В. Муштавинская. — СПб., 2003. — 192 с.

5. *Муштавинская, И. В.* Технология развития критического мышления: научно-методическое осмысление / И. В. Муштавинская // Методист. — 2002. — № 2. — С. 30—35.

УДК 81.22:811.111

**Е. Р. Лосовская**
*Учреждение образования «Барановичский государственный университет», Барановичи, Республика Беларусь, elenalosovskaya@mail.ru*

# РОЛЬ ЭФФЕКТА ПРЕВОСХОДСТВА ИЗОБРАЖЕНИЙ В ОБУЧЕНИИ АНГЛИЙСКОМУ ЯЗЫКУ

В статье рассматривается актуальность и эффективность использования визуальных образов в качестве стимула для развития навыков иноязычного общения. Указаны преимущества визуализации в обучении иностранному языку. Выделены и систематизированы критерии отбора изображений для использования на занятиях, описаны функции изображения.

**Ключевые слова:** методика преподавания иностранных языков; английский язык; наглядность; изобразительные средства; педагогика.

© Лосовская Е. Р., 2022



Репозиторий БарГУ